ПРАВЕРАНА

*Дадатак*

# ПРЫКЛАДЫ СІТУАЦЫЙНЫХ ЗАДАЧ

| Клас | Тэма | Сітуацыйная задача |
|---|---|---|
| 6 | НПБП. Экскурсія № 1 “Жывая і нежывая прырода. Назіранне за жывымі аб’ектамі” | **Падарожжа па сядзібе Марты Красінскай**<br>1. XIX стагоддзе… Гуляючы па сваім парку, памер якога 5 гектараў, пані Марта, уладальніца сядзібы, заблудзілася. Дапамажыце ёй знайсці дарогу да сваёй сядзібы, паказаўшы яе стрэлкамі на карце, якую вы атрымалі.<br>2. Адзначце на карце найбольш значныя і цікавыя для вас жывыя аб’екты, па якіх можна арыентавацца пры правядзенні сучаснай экскурсіі па сядзібе Красінскіх.<br>3. Прапануйце турыстычны маршрут па тэрыторыі аграгарадка Свіслач, які, на ваш погляд, зможа прыцягнуць максімальную колькасць турыстаў у нашу мясцовасць |
| 7 | Дзікарослыя расліны | **Таямнічае дрэва**<br>1. Уважліва прачытайце ўрывак з твора У.Караткевіча.<br>“…Найбольш уразіла яго адно дзіўнае дрэва. Цэлымі гаямі яно сустракалася на берагах ручаін, цераз якія ён ішоў бярвеннямі, а то і проста скачучы па камянях і па беразе Тыгравай. Пальмавай стройнасці, з пышным султанам драбналістых галін недзе ўверсе, яно сонечна шумела над вадой. Вельмі падобнае на эўкаліпт, тугое як струна, яно расло... на камянях…<br>Севярын ведаў, што ў такіх умовах ніводнае дрэва расці не будзе. А гэтае расло, немаведама адкуль чэрпаючы сокі на тое, каб выгнаць у неба ствалы такой вышыні і прыгажосці. І Севярын са здзіўленнем зразумеў, што гэта не эўкаліпт, а нейкая своеасаблівая вярба. Ён яшчэ не ведаў, што гэта была ……..”.<br>2. Вызначыце жыццёвую форму апісанай у тэксце расліны.<br>3. Паспрабуйце вызначыць відавую прыналежнасць апісанага дрэва і закончыце апошні сказ тэксту.<br>4. Прааналізуйце, ці можа існаваць такое дрэва ва ўмовах нашага клімату. Абгрунтуйце сваю думку |
| 8 | Роля птушак у прыродзе і гаспадарцы чалавека. Ахова птушак | **Стужка навін**<br>1. Сёння раніцай у стужцы навін сацыяльных сетак з’явіўся наступны запіс:<br>“В Великобритании, в г. Глазго собираются ввести штрафы для тех, кто будет выплевывать жвачку на улицах. Деньги пойдут на уборку города. В Милтон-Кинсе ввести аналогичные штрафы местным властям предложили предприниматели из группы After8. Стоит |

| | | |
|---|---|---|
| | | отметить, что ежегодно из бюджета Великобритании на очистку городов от жвачек уходит 150 миллионов фунтов. Кроме того, на каждую пачку жевательной резинки будет введен налог.<br>В Диснейленде также введен запрет на жевательную резинку. Посетителей, которые будут замечены со жвачкой, немедленно выводят из парка”.<br>Ніжэй быў размешчаны наступны фотаздымак з подпісам:<br><br><br>2. Як вы лічыце, ці з’яўляецца гэта навіна fake-навінай?<br>3. Па якой прычыне ўводзіцца забарона на ўжыванне жвачак?<br>4. Якія сцверджанні, на ваш погляд, з’яўляюцца біялагічна правільнымі? Абгрунтуйце сваю думку з навуковага пункту гледжання.<br>5. Ці магчыма такая сітуацыя з ластаўкамі нашай мясцовасці? |
| | Разнастайнасць павукападобных: скарпіёны, павукі, кляшчы | **Нябачны вораг**<br>1. Уважліва прачытайце тэкст.<br>«Ля гэтай глухой сцежкі ўвесь час цягнулася нейкая калючая дрэнь. Зробіш некалькі крокаў – і штаны пакрываюцца крупінкамі зялёнага, цупкага насення. Спачатку Севярын праз кожныя колькі там метраў спыняўся і абтрасаў іх (адвальваліся яны лёгка), але потым яму гэта абрыдла, і далей ён ішоў ужо так. Порткі да каленяў былі нібыта ў зялёнай брані. Цяпер яму было ясна, чаму гэтае паскудства толькі ля сцежак. Людзі разносяць на вопратцы. Ён паспрабаваў, ці прыстане насенне да сарочкі, не, ліпнула толькі да сукна. Значыцца, першапачатковы разлік гэтага пустазелля быў на поўсць жывёлы».<br>2. Што такое або хто такія “крупінкі зялёнага, цупкага насення”, апісаныя ў тэксце?<br>3. Зрабіце вывад аб спосабе распаўсюджвання апісаных у тэксце арганізмаў.<br>4. Сфармулюйце правілы паводзін і выберыце форму адзення пры паходзе для бяспечнага наведвання лесу і парку |
| 9 | Значэнне рухальнай | **© “Нікому нічога не даказвай. І заўсёды трымай** |

| | | |
|---|---|---|
| | актыўнасці<br>для захавання<br>здароўя. Пастава.<br>Плоскаступнёвасць | **спіну роўнай”**<br>1. Даведка: Па даных апошняга медыцынскага агляду (верасень 2021 года) 37 вучняў нашай школы (25 %) маюць дыягназ: скаліёз, скаліятычная пастава. 12 вучняў маюць дыягназ: плоскаступнёвасць. 13 з іх з’яўляюцца вучнямі 9–11-х класаў.<br>2. Як вы лічыце, якія фактары паўплывалі на ўзнікненне гэтых захворванняў у вучняў нашай школы?<br>3. Прапануйце варыянты рашэння гэтай праблемы сярод старшакласнікаў.<br>4. Уявіце сябе крэатыўным арт-дырэктарам і стварыце праект флаера (запрашэння) на мерапрыемства, прысвечанае прафілактыцы скаліятычнай паставы |
| 11 | Пагроза экалагічных катастроф<br>і іх папярэджанне | **Гульня на выжыванне**<br>1. Уважліва разглядзіце фотаздымак, які вы атрымалі *18 красавіка ў 19.00* сацыяльных сетках.<br><br>2. Паспрабуйце сфармуляваць адну з экалагічных праблем, якую мы будзем вывучаць на сённяшнім уроку.<br>3. Прапануйце варыянты рашэння праблемы.<br>4. Стварыце постэр, накіраваны на прыцягненне ўвагі насельніцтва да сфармуляванай вамі праблемы |